**Цябут, Д.** Полымя народнага гневу / Д. Цябут // Сцяг камунізму (Полацк). – 1982. – 10 ліп. – С. 2.

## ПОЛЫМЯ НАРОДНАГА ГНЕВУ

Сёлетні год – своеасаблівае свята для былой партызанскай брыгады імя Варашылава – спаўняецца сорак гадоў, як яна была створана ў грозныя і віхурныя дні Вялікай Айчыннай вайны.

З невялічкай групы, дакладней маленькага атрада «Мсцівец», які прыбыў у сорак другім годзе на Полаччыну і выбраў месцам часовай сваёй дыслакацыі лясную мясціну непадалёк ад вёскі Пуканаўка, праз зусім кароткі прамежак часу вырасла партызанская брыгада. Яна ўваходзіла ва Ушацка-Лепельскую партызанскую зону, якую ўзначальваў Герой Савецкага Саюза Уладзімір Елісеевіч Лабанок.

Праз няпоўны год пасля таго дня, як маленькі атрад «Мсцівец» пачаў сваю дзейнасць, у брыгадзе ўжо было шэсць падраздзяленняў: «Смерць фашызму», «За Радзіму», «Гастэла», «КІМ», «Бальшавік» і «Мсцівец». Амаль паўтары тысячы байцоў мужна змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, баранілі свой родны край ад няпрошаных чужынцаў.

У камандным саставе брыгады выявіліся таленавітыя арганізатары народнага партызанскага руху. Гэта – камісар У. А. Лемза, начальнік штаба Я. С. Шапавал, а потым – А. А. Кухта, камандзіры і камісары атрадаў С. П. Нікіфараў, М. К. Платонаў, Л. Л. Асіповіч, П. М. Кісялёў і іншыя.

Партызанскія атрады наносілі ўдары па варожых камунікацыях на чыгунцы Полацк – Маладзечна, на шашэйных і грунтавых дарогах Полацк – Дзісна, Ветрына – Маладзечна, Ветрына – Полацк і іншых. Дзякуючы ўзмацненню партыйнага ўплыву ў масах і актывізацыі баявых дзеянняў, слава аб народных мсціўцах расла з кожным днём. У партызанскія атрады пачалі ўступаць цэлымі сем'ямі, вёскамі. Асабліва ўзмацніўся прыток камсамольцаў і моладзі. І невыпадкова, што два атрады «За Радзіму» і «КІМ» былі, у асноўным, камсамольска-маладзёжнымі.

З ростам і пашырэннем партызанскага руху і актыўных баявых дзеянняў ужо зімой 1942–1943 гг. тэрыторыя Ветрынскага раёна была цалкам вызвалена ад гітлераўскіх захопнікаў за выключэннем чыгункі Полацк – Круляўшчызна і раённага цэнтра Ветрына.

У сувязі з гэтым паўставала задача ўтрымаць у сваіх руках вызваленую тэрыторыю, уберагчы вёскі ад знішчэння, а мірных жыхароў – ад фізічнай расправы і вывазу на прымусовыя работы ў Германію.

На важнасць гэтай задачы ўвесь час указваў ЦК КП(б)Б і Беларускі штаб партызанскага руху. І наша брыгада, як частка агульнай абароны Ушацка-Лепельскай зоны, гэтую задачу паспяхова выконвала.

Утрымліваючы завяяваныя рубяжы і забяспечваючы нармальнае жыццё савецкіх людзей, якія засталіся на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі, брыгада актыўна дзейнічала па разгрому гітлераўскіх гарнізонаў, вываду са строю чыгуначнага палатна, мастоў і іншых збудаванняў, што мелі ваеннае значэнне.

Асноўнай сілай, якая сцэментавала рады народных мсціўцаў, была непахісная вера людзей у перамогу савецкай зброі, савецкага ладу жыцця, любоў і адданасць Камуністычнай партыі.

Ва ўсіх справах, ва ўсіх баявых сутычках з ворагамі наперадзе заўсёды былі камуністы і камсамольцы. Самыя храбрыя, самыя лепшыя, самыя адданыя змагары ляснога фронту ў тых складаных умовах назаўсёды звязалі свой лёс з партыяй.

За час дзеяння брыгады ўступіла ў члены партыі 48 чалавек, у кандыдаты – сто трыццаць чатыры чалавекі.

Камсамольская ж арганізацыя брыгады налічвала ў сваіх радах каля чатырохсот чалавек. Рукамі маладых патрыётаў было скінута пад адхон дваццаць варожых эшалонаў, разбіты дзесяткі вагонаў з жывой сілай ворага і тэхнікай, спалена шмат мастоў, аўтамашын. Ад куль камсамольцаў брыгады знайшлі сваю магілу на зямлі Беларусі сотні гітлераўцаў.

Але вайна ў тыле ворага – гэта не толькі баявыя рэйды, скінутыя пад адхон варожыя эшалоны, спаленыя машыны і знішчаная тэхніка ворага. Трэба было араць зямлю, вырошчваць хлеб, вучыць людзей, клапаціцца пра будучае. Зусім побач быў Полацк, буйны вузел варожай абароны, а тут партызанская зямля, дзесяткі і сотні вёсак жылі па нязменных савецкіх законах. І гэта таксама была зброя, якая набліжала дзень агульнай нашай перамогі над ворагам.

Цяпер, калі прайшлі дзесяткі гадоў з таго часу, яшчэ больш відавочным робіцца той факт, што сапраўды шырокім партызанскі рух стаў магчымым толькі дзякуючы ўсеагульнай падтрымцы насельніцтва, еднасці гэтага руху з усім народам. Вярнуўшыся, часам, з начнога рэйду, народныя мсціўцы, нават не адпачыўшы, пачыналі працу на полі, дапамагаючы вяскоўцам ці сеяць, ці касіць, ці абмалочваць жыта. І насельніцтва з вялікай падзякай успрымала такую дапамогу. Усё што можна было зрабіць, усё што можна было ўнесці ў агульны фонд барацьбы, мірныя жыхары рабілі з чыстай душой, ад сэрца.

Напрыклад, да дня Чырвонай Арміі ў 1943 годзе вяскоўцы паднеслі народным мсціўцам брыгады падарункі – 550 маскіровачных халатаў, 575 пар пальчатак, 311 пар панчох, 250 пар бялізны, шмат іншага адзення. Калі ўлічыць, што тры гады насельніцтва не карысталася паслугамі магазінаў, жыло толькі са старых запасаў і з таго, што магло вырабіць саматужна, дык робіцца відавочнай тая адданасць і любоў, што стаіць за гэтымі сціплымі лічбамі падарункаў.

У 1942 годзе мы праводзілі збор сродкаў на пабудову эскадрыллі самалётаў «Ветрынскі партызан». У той час тэрыторыя, вызваленая намі ад акупантаў, была яшчэ маленькая, але гэта не перашкодзіла нам сабраць сродкі на пабудову баявых машын. Потым праводзіўся збор сродкаў на пабудову танкавай калоны імя БССР. Аблігацыі Дзяржаўных пазык, грошы, залатыя пярсцёнкі, гадзіннікі і іншыя вырабы здавала насельніцтва.

У горкія дні блакады вясной сорак чацвёртага года брыгада вяла жорсткія баі з карнікамі. Баявую задачу, якую паставіла перад ёй камандаванне злучэння, яна выканала добрасумленна.

Мінулі дзесяцігоддзі. Але штогод збіраюцца партызаны на свае ўрачыстасці ў тыя мясціны, дзе некалі кіпелі жорсткія баі з ворагам. Даўно залечаны раны вайны. На тых палях, дзе была праліта кроў народных мсціўцаў, цяпер шумяць збажыной урадлівыя калгасныя палі, грукочуць магутныя машыны. Паўсталі новыя вёскі і пасёлкі на былых руінах і папялішчах. Глядзяць у прастору нябёсаў вялікія і малыя абеліскі народнай славы, нязломнай мужнасці савецкіх людзей.

**Д. ЦЯБУТ,**

**былы камандзір партызанскай брыгады імя Варашылава**